# М. МЯСНІКОВІЧ:

# «МЫ ПАБУДАВАЛІ МОСТ ДА СУСЕДЗЯЎ І РЫНКУ»

**Пакуль палітыкі ў Нова-Агарове спрачаюцца, якім быць Саюзнаму дагавору, палітыкі ў Мінску і іншых рэспубліканскіх сталіцах паспелі ўжо стварыць для яго эканамічны каркас. Беларусь у асноўным сфарміравала ўласную сістэму дагаворных адносін з большасцю суверэнных дзяржаў — як тых, хто збіраецца, так і тых, хто адмаўляецца ўваходзіць у састаў абноўленага Саюза. Ніці прамых сувязей працягнуліся на Украіну і ў Малдавію, Расію і Казахстан, Прыбалтыку і Узбекістан. Наколькі новыя адносіны надзейныя і жыццёвыя? Ці змогуць дагаворы сінхранізаваць работу велізарнага гаспадарчага механізма, стварыць адзіную эканамічную прастору, пагасіць нацыянальныя канфлікты? Адказаць на гэтыя пытанні карэспандэнт БЕЛТА папрасіў першага намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР М. МЯСНІКОВІЧА.**

**— Міхаіл Уладзіміравіч, пасля падпісання некаторых дагавораў мінула ўжо некалькі месяцаў. Аднак штосьці не відаць нават прыкмет стабілізацыі сувязей. Наадварот, дысбаланс у эканоміцы ўзмацняецца, пастаўкі скарачаюцца, разгараецца таможная вайна. У чым жа справа?**

— Не сакрэт, што першыя пагадненні, заключаныя рэспублікай адразу пасля прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце, былі перш за ўсё палітычным актам. Але ўжо імі былі прадугледжаны многія стабілізацыйныя меры. Тут можна ўспомніць пра казахстанскі мільён тон збожжа, які даў нам магчымасць у гэтым годзе сур'ёзна падтрымаць жывёлагадоўлю. У вялікіх аб'ёмах атрымліваем мы з Расіі газ і нафту. Без гаручага машыны ў рэспубліцы яшчэ не стаялі. А паспрабуйце заправіць свае «Жыгулі» на Украіне, у Прыбалтыцы, Грузіі!

У пачатку гэтага года ідэі фарміравання агульнай эканамічнай прасторы атрымалі далейшае развіццё. Над заваламі і руінамі ранейшай цэнтралізаванай сістэмы размеркавання і сувязей былі пабудаваны новыя масты, па якіх работнікі вытворчасці змаглі пайсці насустрач адзін аднаму. І сёння каля сямідзесяці працэнтаў камплектуючых, большасць тавараў народнага спажывання ахоплены сеткай прамых дагавораў паміж прадпрыемствамі.

Урад узяў на сябе забеспячэнне рэспублікі асноўнымі сыравіннымі рэсурсамі і прадуктамі харчавання. І тут мы не зведвалі б асаблівых цяжкасцей, калі б сітуацыя на сыравінным рынку не ўскладнілася з-за гульні цэн на нафту, вугаль, метал. Пастаўшчыкі чакаюць, не хочуць заключаць дагаворы. Але якім бы ні было канчатковае рашэнне, смяротным прыгаворам для эканомікі рэспублікі, як сяму-таму здавалася яшчэ нядаўна, яно не стане. Эксперты падлічылі: сёння станоўчае сальда Беларусі ў гандлі з іншымі рэгіёнамі краіны перавышае паўтара мільярда рублёў. Калі разлікі будуць весціся ў цэнах сусветнага рынку, беларускія прадпрыемствы ўсё роўна не акажуцца ў пройгрышы, паколькі адпаведна даражэйшай стане і іх прадукцыя.

Цяпер нам патрэбны толькі дакладнасць гаспадарчай рэформы, палітычная стабільнасць, каб можна было спакойна дамаўляцца і купляць усё, што трэба.

**— Калі маеш хадавую прадукцыю, прадаць або абмяняць яе — не праблема. Толькі ж у апошні час і беларуская прамысловасць пачынае даваць збоі. Ці не атрымаецца так, што ў абмен на збожжа і бавоўну нам неўзабаве проста не будзе чаго прапанаваць?**

— Калі чатыры гады назад прымалася рашэнне аб згортванні прамысловага будаўніцтва, яно было цалкам апраўданым: трэба было абараніць людзей ад чарнобыльскай бяды, узняць узровень іх жыцця. Гэты курс, нягледзячы на ўсе цяжкасці, у нас паслядоўна праводзіцца. І калі яшчэ зусім нядаўна, займаючы трэцюю-чацвёртую пазіцыю па ўзроўню атрыманага нацыянальнага даходу на душу насельніцтва, наша рэспубліка была толькі сёмай-восьмай па ўзроўню заработнай платы, то сёння гэтыя паказчыкі зраўняліся. Напомню, што Беларусь адзіная ў краіне адмяніла ўсякія абмежаванні на рост заработнай платы.

Але калі і далей працягваць палітыку абмежавання інвестыцый у народную гаспадарку, мы сапраўды можам аказацца ў тупіку. Станкі зносяцца, прадукцыя ўстарэе, і купляць яе ніхто не захоча. За тэлевізар «Гарызонт», які ў нас лічыцца апошнім словам тэхнікі, на Захадзе даюць 250 долараў, а за аналагічны па параметрах «Шарп» або «Соні» — 1250. Цудоўны, можа быць, лепшы ў свеце грузавы аўтамабіль «Перабудова», створаны на МАЗе, старэе, так і не трапіўшы ў серыю...

Адным словам, калі мы збіраемся жыць цывілізавана, развіваць гандаль і сувязі, нарэшце, ісці ў рынак, то павінны прымаць і яго жорсткія законы барацьбы за канкурэнтаздольнасць, найвышэйшы тэхнічны ўзровень тавараў. А без буйных дзяржаўных капукладанняў на сучасны ўзровень прамысловасці не ўзняцца...

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь